***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# СУЧАСНАЯ НАВУКОВАЯ АЦЭНКА РОЛІ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэма Вялікай Айчыннай вайны і вытокаў перамогі народаў СССР над вераломным, жорсткім, надзвычай арганізаваным, высока тэхналагічна ўзброеным і ідэалагічна маналітным ворагам застаецца па-ранейшаму актуальнай. Сучасная моладзь уяўляе з сябе ўжо трэцяе пасляваеннае пакаленне, тым не менш, яна актыўна цікавіцца праблемнымі пытаннямі Другой сусветнай вайны. Атрымаць адказы на іх ва ўмовах інфармацыйнага грамадства можна з разнастайных крыніц, асабліва на сайтах Інтэрнэта, якія прадстаўляюць факталагічныя звесткі і высновы рознага, нават супрацьлеглага, зместу.

Навукоўцы, якія прафесійна займаюцца вывучэннем, трансляцыяй і прэзентацыяй падзей вайны, таксама прытрымліваюцца не супадаючых пазіцый па многіх праблемах. Некаторыя прадстаўнікі заходнееўрапейскай ваенна-гістарычнай школы лічаць, што ў савецкай і постсавецкай гістарычнай навуцы і зарыентаванай на яе практыцы, напрыклад музейнай, не раскрываюцца праблемы апраўданасці такіх вялікіх ахвяр з савецкага боку, у тым ліку і ваеннапалонных, генацыду яўрэйскага насельніцтва, прымусовай працы мірнага насельніцтва, адсутнічае крытычны аналіз знешняй палітыкі СССР у перадваенны перыяд і інш.

З навуковага пункту гледжання названыя і шматлікія іншыя праблемы ваеннай гісторыі выклікаюць заканамерны інтарэс, але не меншае значэнне працягвае захоўваць і вызначэнне вытокаў перамогі савецкага народа. Так, мы павінны імкнуцца да самага поўнага і аб’ектыўнага прадстаўлення аб многіх і многіх падзеях вайны, аднак, самі па сабе, дасягнутыя факталагічныя веды не адкажуць на галоўнае пытанне: чаму, паклаўшы на алтар Перамогі каля 27 млн чалавек (з іх амаль палова мірнага насельніцтва), аддаўшы ворагу значную частку еўрапейскай тэрыторыі СССР,

дапусціўшы ворага да Сталінграда, народ змог знайсці сілы пераламіць ход вайны? Якія лічбы могуць патлумачыць, чаму савецкія лётчыкі ішлі на таран варожых самалётаў, чырвонаармейцы кідаліся з гранатамі пад нямецкія танкі, на амбразуры дзотаў? Чаму падобныя прыклады адсутнічаюць у нямецкай арміі, нават падчас баёў на тэрыторыі Германіі?

Такія пытанні можна б было і прадоўжыць, аднак мы лічым магчымым засяродзіць увагу на наступным моманце: амаль не сустракаецца ў крытычных матэрыялах заўваг на недастатковую распрацаванасць пытання аб ролі праваслаўнай царквы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як бы забываецца гэты найважнейшы аспект, абыходзіцца ўвагай той факт, што ў іншых еўрапейскіх краінах усе ваенныя падзеі асяняліся словам Божым. Гітлераўская Германія планавала вайну з СССР як крыжовы паход супраць камунізму, нездарма на салдацкіх раменных спражках красаваліся словы «З намі Бог». У гэтай сувязі можна нагадаць і прамову англійскага караля 3 верасня 1939 г. пры аб’яўленні вайны нацысцкай Германіі, якая пачыналася і заканчвалася словамі ўдзячнасці Богу і спадзяваннямі на яго дапамогу.

Праваслаўныя вернікі СССР, а гэта большасць насельніцтва шматнацыянальнай краіны, былі пазбаўлены такой надзеі і апоры. Стан праваслаўнай царквы напярэдадні вайны быў крытычны і для гэтага былі прычыны. Па-першае, яе існаванне на працягу двух стагоддзяў без Патрыярха, пад патранажам калектыўнага органа – Свяшчэннага Сінода, паступова вяло да абміршчэння царквы, да падпарадкавання яе свецкай уладзе, у чым выразна праяўляўся прынцып «цэзарэпапізму». Па-другое, выбары ў 1918 г. Патрыярхам настроенага супраць Саветаў мітрапаліта Ціхана, садзейнічалі расколу рускай праваслаўнай царквы і з’яўленню плыні «абнаўленцаў», якія прызнавалі неабходнасць супрацоўніцтва з савецкай уладай. Па-трэцяе, рэпрэсіі 1937–1938 гг. напрамую закранулі царкву: у 1937 г. было арыштавана 136 900 праваслаўных святароў, з іх растраляна 85 300, у 1938 г. адпаведна 28 300 і 21 500. У гэтыя гады быў знішчаны амаль увесь праваслаўны епіскапат, на кафедрах заставалася толькі 4 архірэі – патрыяршы Месцаблюсціцель Сергій, ленінградскі мітрапаліт Алексій, архіепіскап Дзмітраўскі Сергій і архіепіскап Пецяргофскі Мікалай. Па-чацвёртае, перадваенная трэцяя пяцігодка была аб’яўлена «бязбожнай», па заканчэнні якой у 1943 г. павінен быў быць зачынены апошні храм. Адбывалася масавае закрыццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

храмаў. У 1935 г. у РСФСР было 25 тыс. цэркваў, а да канца 1938 г. іх засталося 1277, не існавала ні аднаго манастыра. У Мінску дзейнічала толькі адна праваслаўная царква, – у адным з касцёлаў паказвалі кіно, а ў другім знаходзіўся архіў НКУС.

Разам з тым за два дзесяцігоддзі савецкая ўлада не змагла паставіць пад поўны кантроль духоўнае жыццё грамадства. Па перапісе 1937 г. веруючымі прызналі сябе каля 70 % сеьскага і амаль палова гарадскога насельніцтва. Нам падаецца, што гэты факт адлюстроўвае адну з крыніц будучай перамогі, таму што ў народа заставаўся духоўны патэнцыял, напрацаваны на працягу стагоддзяў, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне, і за 20 год яго не паспелі знішчыць.

Рэакцыя рускай праваслаўнай царквы на нападзенне фашысцкай Германіі была надзвычай выразнай. Вайна пачалася ў Дзень Усіх Святых, у зямлі Расійскай праззяўшых. Патрыяршы Месцаблюсціцель Сергій, адслужыўшы літургію ў Богаяўленскім саборы г. Масквы, напісаў і сам надрукаваў на машынцы «Послание пастырям и пасомым Христовой Православной Церкви». У ім былі і такія словы: «Православная наша Церковь всегда разделяла судьбу народа. Вместе с ним она испытания несла и утешалась его успехами. Не оставит она народа своего и теперь…»

Аднак для служыцелей царквы на акупіраванай ворагам тэрыторыі настаў час выбару. Сітуацыя ўскладнялася тым, што ў 1930-я гады дзейнасць праваслаўнай царквы ў БССР фактычна была спынена, а ў Заходняй Беларусі дзейнічала створаная ў 1922 г. Польская аўтакефальная праваслаўная царква, прызнаная Канстанцінопальскім патрыярхам.

У час акупацыі нямецкія ўлады абвясцілі Беларускую аўтакефальную праваслаўную царкву, аднак кананічна яна не была афармлена. Мітрапалітам Мінскім і ўсея Беларусі быў Панцеляймон, які пачаў служэнне ў Беларусі з 1920 г. на пасадзе епіскапа Пінскага. У 1922–1939 гг. знаходзіўся ў розных манастырах Польшчы пад наглядам з-за сваіх негатыўных адносін да царкоўнай палітыкі польскага ўрада.

На працягу першага года акупацыі ў Мінскай епархіі было адноўлена 120 царкоўных прыходаў з 400, якія існавалі да рэвалюцыі. Улічваючы вышэйадзначаную сітуацыю, безумоўна, існавала праблема са святарамі, а там, дзе яны былі, складваліся вострыя адносіны з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі і са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структурамі мясцовых калабарацыяністаў. Першыя былі незадаволены тым, што мясцовае насельніцтва плаціла святарам прадуктамі за адпраўленне царкоўных абрадаў. У асобых выпадках улады ўжывалі розныя формы пакарання святароў за непадпарадкаванне іх распараджэнням наконт аплаты. Другія – кляймілі дзейнасць святароў як русафільскую і антыдзяржаўную, лічылі іх «нявыхаванымі і неадукаванымі расійцамі». Як адзначае адзін з сучасных нямецкіх даследчыкаў: «Беларуская праваслаўная царква, адрэзаная ад сваіх духоўных цэнтраў, заставалася інструментам у руках нямецкіх акупантаў. Яе кіраўніцтва … выконвала тую функцыю, што ўжо была прадвызначана для яе засваеннем тэрыторый Усходу» [1, с. 123].

З 1943 г., пасля пералому ў ходзе вайны, акупацыйныя ўлады звярталі мала ўвагі на рэлігійны бок жыцця насельніцтва. У імя дасягнення сваёй мэты яны не спыняліся ні перад чым, нават перад святатацтвам. Вядомыя выпадкі, калі людзі знішчаліся ў царкоўных будынках. Такая трагедыя адбылася ў в. Малая Плотніца Палескай вобласці, в. Жыдча Пінскага раёна, в. Дары Валожынскага раёна і інш. У лютым 1943 г. фашысцкае камандаванне арганізавала супраць партызанскага злучэння В. З. Каржа карную экспедыцыю. Каб захаваць мірных жыхароў, партызанскае кіраўніцтва вырашыла ажыццявіць перадыслакацыю і забраць, па-магчымасці, большую частку з сабою, аднак многія не змаглі пайсці з партызанамі і загінулі пакутніцкай смерцю. У вёсцы Хорастава, адным з цэнтраў партызанскага злучэння В. З. Каржа на поўдні Міншчыны, у Свята-Пакроўскай царкве 15 лютага 1943 г. было спалена больш за 300 чалавек разам са святаром Іаанам Лойка. Ён служыў літургію і прычашчаў людзей, якія спявалі малітвы да канца.

Не спыняліся карнікі і перад пакараннем святароў. Напрыклад, былі растраляны святары У. Назарэўскі, А. Валасовіч і інш. Нельга абысці ўвагай духоўны подзвіг святара Свята-Петра-Паўлаўскай царквы ў Ружанах Іаана Наўроцкага. Яго рашучасць у першыя дні вайны дапамагла захаваць многія жыцці. Айцец Іаан атрымаў дазвол нямецкага камандавання на пахаванне загінуўшых і аказанне дапамогі параненым у баях за Ружаны. На гэтую богаўгодную акцыю ён падняў усіх жыхароў Ружан і навакольных вёсак. Раненых аперыравалі ў царкве, «пад абразамі», як гаварылі людзі. Жыхары пасёлка перадаюць з пакалення ў пакаленне ўспамін аб яшчэ адным учынку свайго святара: ён паручыўся за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ружанскіх мужчын, якіх беспадстаўна абвінавацілі ў забойстве нямецкага салдата. Як гарантыю невінаватасці сваёй паствы ён прапанаваў немцам у якасці заложнікаў сваю жонку і дзвюх малалетніх дачушак. Шмат іншых добрых спраў здзейсніў айцец Іаан у гады акупацыі, яго духоўны подзвіг увекавечаны ў сэрцах многіх людзей.

На часова акупіраванай тэрыторыі царкоўныя служыцелі прымалі ўдзел ва ўзброенай барацьбе. На тэрыторыі Беларусі гэта датычыцца ў першую чаргу заходніх абласцей, таму што ва ўсходніх цэркваў не было, а значыць, не было і святароў. Дакументы захавалі факты супрацоўніцтва служыцелей культа з партызанамі. Напрыклад, святар з Палескай вобласці Аляксандр Рамануўка з 1942 па ліпень 1944 г. падтрымліваў сувязь з партызанамі, удзельнічаў у баявых аперацыях, хадзіў у разведку. Дапамагаў партызанам і Яўген Крокас – святар з вёскі Мілевічы Пінскай вобласці. Вышэй мы расказвалі аб духоўным подзвігу айца Іаана Лойкі з вёскі Хорастава, навакольныя лясы якой сталі асноўнай базай партызанскага злучэння, якім камандаваў генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза В. З. Корж. Перад сваёй гераічнай смерцю бацька благаславіў сваіх трох сыноў змагацца з ворагам у адным з партызанскіх атрадаў злучэння.

Аб двух святарах з Заходняй Беларусі маюцца дакументальныя матэрыялы. Адзін з іх – Васіль Данілавіч Капычка быў настаяцелем храма ў вёсцы Адрыжын Драгічынскага раёна, у гады вайны з’яўляўся сувязным партызанскай брыгады імя В. М. Молатава. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь знаходзіцца дакумент, у якім святар заяўляе, што «ў інтарэсах канчатковага разгрома фашызму, бяру абавязак працаваць на карысць Радзімы». За заслугі перад Радзімай айцец Васіль быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, некалькімі медалямі. Другі – Віктар Васільевіс Бекарэвіч, займаў царкоўныя пасады ў Вілейскім раёне і Стоўбцах, у Айчынную вайну ён выконваў заданні партызан і Маладзечненскага падпольнага райкама партыі, за што быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і баявымі медаламі.

Партызанам брыгады імя В. У. Куйбышава стаў святар К. Раіна з палескай вёскі Хойна, што непадалёк ад Пінска. У складзе невялічкай групы ён ажыццяўляў тлумачальную работу сярод мясцовага насельніцтва, заклікаў людзей да аб’яднання, узаемадапамогі, прасіў забываць усялякую варожасць і суседскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

непаразуменні, таму што вораг, які адступае, зусім рассвірапеў і можа выкарыстаць усе негатыўныя моманты для расправы. У Нацыянальным архіве захавалася справаздача святара за студзень 1944 г. Напрыклад, 13–17 студзеня аб'язджаў зямлянкі ў лесе жыхароў в. М. Плотніца і в. Бобрык. Настрой людзей добры, адчуваецца поўны давер да партызан і надзея на хутчэйшае вызваленне. Тры сыны святара К. Раіна сталі падпольшчыкамі, а потым партызанамі, былі ўзнагароджаны баявымі ардэнамі і медалямі. Пасля вайны яго сыны сталі святарамі [2, с. 291].

Такім чынам, факты, выкарыстаныя ў артыкуле, выразна адлюстроўваюць выключна важнае месца, якое, па сваёй ініцыятыве заняла праваслаўная царква ў барацьбе з ворагам з першых дзён вайны. Асабліва ў складанай сітуацыі аказалася праваслаўная царква на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, аднак прыведзеныя факты раскрываюць духоўны подзвіг служыцеляў царквы, якія засталіся са сваімі вернікамі і даступнымі ім сродкамі змагаліся за свабоду Айчыны.

1. *К'яры, Б.* Штодзённасць за лініяй фронту: Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) / Б. К'яры ; пер. з ням. Л. Баручэўскага ; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск, 2005. – 390 с.
2. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ